УДК 271-055.1

# НОВЫЯ МУЖЧЫНСКІЯ РЭЛІГІЙНЫЯ ОРДЭНЫ КОНТРРЭФАРМАЦЫІ

**Клімуць Лада Яраславаўна**
Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя А. А. Куляшова (Беларусь)

*Новыя рэлігійныя ордэны адыгралі вялікую ролю ў паляпшэнні становішча каталіцкай царквы ў XVII ст. Дзякуючы ім каталіцкая царква стала сусветнай.*

Новыя рэлігійныя ордэны Каталіцкай Рэфармацыі заўсёды прыцягвалі ўвагу. Пра жаночыя ордэны Контррэфармацыі мы пісалі раней [1]. Новыя ордэны будуць фарміраваць каталіцызм наступныя 500 гадоў. Само стварэнне новых ордэнаў гаворыць пра жыццяздольнасць каталіцтва. Прадстаўлены даклад засяроджвае ўвагу на новых мужчынскіх ордэнах Контррэфармацыі. Усе яны, за выключэннем іспанскіх Босых кармелітаў, аддавалі перавагу актыўнай дзейнасці над малітвай. У большасці ордэнаў былі святары і мірскія браты. Большасць з іх працавалі з беднымі і няшчаснымі. Многія распаўсюдзіліся ў Азію, Афрыку і Амерыку, але новых членаў па-за Еўропай было нямнога. Сродкаў усім не хапала, але ў гэтым быў свой добры бок, бо менш вышэйстаячых умешваліся ў іх дзейнасць.

Члены большасці новых мужскіх ордэнаў падзяляліся на дзве групы: свецкія браты і святары ці тыя, хто рыхтаваўся на святара. Некаторыя свецкія браты былі ўдаўцамі ва ўзросце. Так, архітэктар Джавані Трыстана паступіў да іезуітаў ва ўзросце 40 гадоў [1, с. 163]. А вось сярод тэатынцаў большасць кандыдатаў былі ўжо святарамі. Малодшыя сыны шляхты часта прысвячалі сябе рэлігійнаму жыццю. У іспаніі толькі іезуіты прымалі кандыдатаў яўрэйскага паходжання. Але ў 1593 г. пад ціскам Філіпа II гэта было забаронена. Капуцыны, якія працавалі сярод сялян і гарадской беднаты, і піяры, якія вучылі іх дзяцей, прываблівалі многа таленавітых маладых людзей з ніжэйшых класаў.

Правілы св. Францыска Асізскага так высока ўзнялі стандарт беднасці, што гэта прывяло да расколу сярод францысканцаў. У рэшце рэшт з усіх схізм выйшаў поўнасцю незалежны ордэн капуцынаў (1619).

У адрозненне ад астатніх ордэнаў у іх не было кананізаванага заснавальніка. Матэа да Башыя, ад адзення якога пайшла назва капуцыны, не меў намеру ствараць новы ордэн і вярнуўся ў Ордэн меншых братоў. Аднак асобны ордэн капуцынаў стаў хутка расці ў італьянскай Марцы. Ордэн падвергся расследаван-



Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова

ню па абвінавачванні ў схільнасці да пратэстантызму, быў апраўданы, але яго дзейнасць да 1574 г. абмяжоўвалася італіяй.

Большасць першых капуцынаў жылі на ўскраінах мястэчак і прасілі міластыню. З усіх новых ордэнаў капуцыны раслі найхутчэй, асабліва пасля 1574 г. іх найвялікшым прапаведнікам быў св. Ларэнца да Брындзізі, які быў генеральным вікарыем у 1602–1605 гг. і рашыў праблему расколу ордэна. Апошнія гады жыцця ён правёў у Цэнтральнай І Усходняй Еўропе, у тым ліку ў Рэчы Паспалітай, а памёр ён у Партугаліі.

У XVI ст. духоўныя І матэрыяльныя патрэбы італьянскага народа натхнілі на стварэнне мноства невялікіх рэлігійных ордэнаў ці кангрэгацый. З-за свайго невялікага памеру яны імкнуліся аб’ядначца з іншымі ордэнамі, але няўдала. Як прыклад такіх ордэнаў можна назваць тэатынцаў, аратарыянцаў, піяраў.

Самым значным рэлігійным ордэнам XVI ст. былі іезуіты. Яны хутка абышлі астатнія ордэны па колькасці, акрамя капуцынаў [1, с. 171]. іезуіты звычайна працавалі ў гарадах І сярод сярэдняга І вышэйшага класаў. іх заснавальнік Лаёла быў баскам. Адрозненне гэтага ордэну ў тым, што ад пачатку ён быў інтэрнацыянальным. Павел III зацвердзіў ордэн у 1540 г.

Канстытуцыя ордэна, зацверджаная ў 1558 г., утрымоўвала мноства навацый. Галоўным аб’ядначым фактарам для іезуітаў быў акцэнт на цэнтралізацыі ўлады І паслухмянасці. Трэба адзначыць, што дадатковы чацвёрты зарок, які прыносілі айцы-прафесы, не быў абяцаннем безаглядна паслухмянасці папе рымскаму, гэта была клятва адпраўляцца ў місію туды, куды накіруе папа. Але гэта садзейнічала лаяльнасці іезуітаў да папы рымскага.

Іезуіты захоўвалі свае сямейныя імёны. У іх не было абавязковых фізічных пакаянняў. Іх канстытуцыі былі намнога больш дэталізаванымі. Навацыі іезуітаў і сама іх назва – Таварыства Ісуса – здаваліся фанабэрыстасцю і выклікалі незадаволенасць іншых ордэнаў. Іншыя ордэны абмяжоўвалі сваю дзейнасць: ці лячэнне хворых, ці дапамога сіротам, ці адукацыя. А іезуіты займаліся практычна ўсім.

Міюіі іезуітаў працавалі па ўсім свеце. У 1601 г. іезуіцкі манастыр быў заснаваны нават у Пекіне. Матэа Рычы і яго пераемнікі насілі адзенне мандарынаў І лічылі, што ў кітайскай культуры ёсць многае, што пасля невялікай мадыфікацыі будзе адпавядаць хрысціянскай веры, як культ продкаў, напрыклад. Аднак папа рымскі ў 1710 г. не пагадзіўся з гэтым.

іезуіцкія місіянеры павінны былі адсылаць справаздачы ў Рым. Іх часта публікавалі, і гэта распаўсюджвала веды пра іншыя культуры. Сёння гэта каштоўныя гютарычныя крыніцы.

Іезуіты многа працавалі сярод сялян. У гэтым яны саступалі толькі капуцынам. Таксама іезуіты былі армейскімі капеланамі і гінулі ў войнах. іезуіты пазбягалі службы ў інквізіцыі не таму, што яны былі супраць гэтага інстытуту, а таму, што не хацелі напружанасці з дамініканцамі, якія складалі большасць інквізітараў.

Лаёла І яго першыя спадзвіжнікі першапачаткова не планавалі займацца педагагічнай дзейнасцю, але менавіта адукацыя стала галоўным напрамкам іх намаганняў. Першы іх калегіум у Месіне ў 1548 г. фінансаваў гарадскі ўрад. Увогуле іезуіты згаджалюя адкрываць калегіумы толькі там, дзе ім абяцалі фінансаванне. Універсітэты адчувалі пагрозу з боку іезуіцкіх калегіумаў, таму што вучэбная праграма ў іезуітаў вельмі хутка пашыралася і стала фактычна



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

ўніверсітэцкай па ўзроўню. І, напрыклад, у Парыжы, Падуі і Ліме апазіцыя з боку ўніверсітэтаў прымусіла іезуітаў закрыць свае калегіумы.

Праграма іезуіцкіх калегіумаў складалася па ўзору Паржыскага ўніверсітэту, арганізацыя якога зрабіла вялікае ўражанне на Лаёлу. Асноўны акцэнт ставіўся на латынь і лацінскіх аўтараў. Студэнты ўдзельнічалі ў класных дыспутах, і іезуіты нярэдка запрашалі бацькоў студэнтаў і эліту горада прысутнічаць на публічных прамовах студэнтаў і выкладчыкаў. У XVIII ст. іезуіты ўводзілі матэматыку і гісторыю ў праграму навучання.

У большасці рэлігійных ордэнаў былі сувязі са свецкімі брацтвамі. У сувязі з іезуітамі самай вядомай была Марыянская кангрэгацыя (Садальнасць Маці Божай). Садальнасці былі самай важнай сілай у распаўсюджванні духоўнасці па іезуіцкаму ўзору.

Хоць іспанія адыгрывала вядучую ваенную ролю ў Контррэфармацыі, яна дала толькі два новых мужчынскіх ордэна – Браты гаспітальеры і Босыя кармеліты. Але ні адзін з іх не адпавядаў вобразу Божага воіна. Афіцыйнае ўхваленне ад папы гаспітальеры атрымалі ў 1572 г., і хутка ордэн распаўсюдзіўся ў амерыканскіх калоніях.

Звычайна ўзнікалі спачатку мужчынскія ордэны, а затым магло з'явіцца адгалінаванне для жанчын. У выпадку з Босымі кармелітамі ўсё было якраз наадварот. Але па колькасці яны саступалі кармелітам.

Рэформу французскага каталіцызму замаруджвалі рэлігійныя войны. Але паступова Французскія аратарыянцы станаваліся супернікамі іезуітаў, таму што іх калегіумы прапаноўвалі больш сучасную праграму. У 1592 г. быў заснаваны ордэн дактрынёраў для навучання бедных. Але самай паспяховай новай французскай кангрэгацыяй сталі лазарысты. Яны распаўсюдзіліся ў італію, ірландыю і Польшчу. Галоўнай іх дзейнасцю было місіянерства.

У цэлым можна сказаць, што, нягледзячы на прагрэс пратэстантызму, у 1650 г. становішча каталіцкай царквы было нашмат лепшым, чым у 1500 г., і не ў малой ступені дзякуючы дзейнасці новых ордэнаў. Каталіцкая царква стала сапраўды сусветнай царквой.

## Літаратура

1. Клімуць, Л.Я. Жаночыя рэлігійныя ордэны ў перыяд Контррэфармацыі // Религия и общество – 8: сборник статей / под общ. ред. В.В. Старостенко. – Могилев: МГУ им. А. А. Кулешова, 2014. – С. 88–91.

2. The Cambridge History of Christianity: in 9 v. / Edited by S R. Po-Chia Hsla. – Volume 6: Reform and Expansion 1500–1660. – Cambridge University Press, 2007. – 713 p.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова